РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 студзеня 2025 г. ПЯТНІЦА № 10 (30398)

# «МОТАВЕЛА ПАВІННА ЖЫЦЬ, І ГЭТА НЕПАРУШНЫ ПРЫНЦЫП»

## Як знакамітае прадпрыемства атрымала другое жыццё



Фота БелТА.

Заснаваны ў 1945 годзе Мінскі мотавелазавод за сваю вялікую гісторыю бачыў многае. Прадпрыемства памятае росквіт, нездарма ж брэнды «АИСТ» і «МІНСК» вядомыя ва ўсім свеце яшчэ з савецкіх часоў. У багатай гісторыі ёсць і чорныя палосы, выхад з якіх шукалі не адзін год. Варыянтаў, што рабіць з прадпрыемствам падчас яго крызісу, было шмат. Сярод іх нават была прапанова поўнасцю знесці вытворчыя аб'екты і пабудаваць на гэтай тэрыторыі жылыя дамы. Але Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка катэгарычна гэта забараніў і заявіў, што на гэтым месцы павінна быць толькі вытворчасць. І вытворчасць высокатэхналагічная і чыстая, што надзвычай важна для сталіцы. «Трэба зрабіць узорны тэхнапарк і на яго ўзор развіваць у іншых гарадах і месцах», — такую задачу паставіў кіраўнік дзяржавы ў сакавіку 2021 года. СТАР. 2–3



«БУДАЎНІЧАЯ АМНІСТЫЯ» Ў ДЗЕЯННІ 7




ЧАМУ БЕЛАРУСАМ У ПОЛЬШЧЫ НЕБЯСПЕЧНА 13

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

# КАБ НІХТО НЕ САПСАВАЎ СВЯТА

26 студзеня 2025 ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Як будзе ажыццяўляцца бяспека падчас выбараў

Ужо праз некалькі дзён у нашай краіне пачнецца галоўны этап электаральнай кампаніі — галасаванне. Для беларусаў выбары Прэзідэнта краіны заўсёды асацыіруюцца з сапраўдным святам. Тым не менш не варта забываць пра бяспеку. Як правіла, традыцыйна падчас датэрміновага галасавання сілавыя структуры краіны пераходзяць на ўзмоцнены варыянт нясення службы. Гэта робіцца для таго, каб забяспечыць бяспеку не толькі грамадзян, якія прыйдуць галасаваць, але і саміх членаў выбарчых камісій, для таго, каб выбары прайшлі без усялякіх здарэнняў і парушэнняў. Якія меры будуць прымаць праваахоўнікі і ратавальнікі, каб падчас галасавання не было непрыемных неспадзяванак, расказалі на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры.

### СІСТЭМЫ ВІДЭАНАЗІРАННЯ, ТРЫВОЖНЫЯ КНОПКІ, ІМГНЕННАЕ РЭАГАВАННЕ

«У мэтах выканання задач па забеспячэнні бяспекі ў перыяд электаральнай кампаніі Міністэрствам унутраных спраў наладжана ўзаемадзеянне з выбарчымі камісіямі, выканкамамі і іншымі зацікаўленымі, — адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Аляксандр КУПЧЭНЯ**. — З асабовым складам праведзены заняткі аб асаблівасцях заканадаўства аб выбарах. Акрамя таго, праведзены неабходныя камандна-штабныя вучэнні і трэніроўкі. Арганізавана прыняцце дадатковых мер па абследаванні і абсталяванні памяшканняў участковых камісій сістэмамі відэаназірання і трывожнымі кнопкамі. Да пачатку датэрміновага галасавання ўсе аб'екты будуць абсталяваны ўсім неабходным». СТАР. 11